УДК 338 (476)

У.У. Валетка, ст. выкладчык

# АЦЭНКА ПЕРСПЕКТЫВАЎ ВЫКАРЫСТАННЯ КАНЦЭПЦЫІ ПРАМЫСЛОВЫХ КЛАСТЭРАЎ У ТРАНСФАРМАЦЫЙНАЙ ЭКАНОМІЦЫ

The main areas of research are industrial competitive advantage development and perspectives of «industrial cluster» concept implementation during transformation period.

У эканоміцы Беларусі працягваецца трансфармацыйны перыяд, калі адбываецца станаўленне рынкавых адносінаў. Завяршэнне асноўных этапаў трансфармацыі: стабілізацыі, лібералізацыі і інстытуцыйных зменаў з'яўляецца ўмовай эфектыўнай рэструктурызацыі гаспадаркі, росту прадукцыйнасці працы і паляпшэння на гэтай аснове ўзроўню жыцця насельніцтва [1].

Трансфармацыйныя працэсы ў эканоміцы Беларусі адбываюцца на фоне працэсу глабалізацыі, калі фармуецца сусветны рынак без межаў, павышаецца мабільнасць фінансавых сродкаў, расце колькасць транснацыянальных кампаніяў і назіраецца пераход да інфармацыйнай эканомікі. Таму для прадпрыемстваў Беларусі, асабліва для буйных, вытворчыя магутнасці якіх перавышаюць унутраныя патрэбы краіны, стратэгічна важна праводзіць рэструктурызацыю, каб заняць устойлівае месца ў сусветным падзеле працы і стаць стабільнымі звеннямі ланцужкоў ТНК.

Скасаванне геаграфічных межаў у працэсе глабалізацыі не азначае, што месцазнаходжанне і мясцовыя ўмовы развіцця прадпрыемстваў губляюць сваю ролю ў эканамічнай дзейнасці. Значная частка навукоўцаў лічыць, што глабалізацыя больш узмацняе, чым памяншае значэнне месцазнаходжання, і хутчэй рэгіянальная эканоміка, чым нацыянальная, з'яўляецца ключавым цэнтрам стварэння дабрабыту і міжнароднага гандлю [2, 3, 4]. Сама глабальная інтэграцыя ўзмацняе лакальную спецыялізацыю, паколькі зніжэнне выдаткаў транспартавання і гандлёвых бар'ераў дазваляе фірмам канцэнтравацца з мэтай выйгрышу ад вонкавай эканоміі на маштабе вытворчасці [5]. Канцэнтрацыя фірмаў робіць магчымым узнікненне перавагаў ад розных формаў рынкавых і нярынкавых спадарожных эфектаў (*spillovers*), якія, у сваю чаргу, садзейнічаюць росту лакальнай інавацыйнасці і прадукцыйнасці [6]. Як падкрэслівае М. Портэр, «устойлівыя канкурэнцыйныя перавагі ў глабальнай эканоміцы часта моцна лакалізаваны і ўзнікаюць дзякуючы канцэнтрацыі высокаспецыялізаванай кваліфікацыі і ведаў, інстытутаў, канкурэнцыі, бізнесу, дасведчаных спажыўцоў» [2].

Існыя і патэнцыйныя крыніцы лакальных канкурэнтных перавагаў М. Портэр прыводзіць ў выглядзе ўмоўнага ромба (малюнак). Варта адзначыць, што сярод усіх прыведзеных на малюнку фактараў, якія абумоўліваюць развіццё канкурэнтных перавагаў, найбольш важным з'яўляецца канкурэнцыя на ўнутраным рынку асобнага рэгіёну ці краіны ў цэлым. Мясцовым уладам не варта пападацца ў пастку памылковай думкі, што ўнутраная канкурэнцыя – гэта нешта залішняе, маўляў, выпуск аднаго віду прадукцыі на некалькіх прадпрыемствах рэгіёну і адкрыццё з гэтай мэтай новых прыватных фірмаў – гэта непатрэбнае спажыўцу дубляванне высілкаў у адным накірунку, якое перашкаджае прадпрыемствам дасягаць большых маштабаў вытворчасці. Наадварот, чым большая лакалізацыя канкурэнтаў, чым больш інтэнсіўнае канкурэнтнае спаборніцтва – тым большыя перавагі прадпрыемствы будуць мець на вонкавых, значна больш ёмістых рынках, дзе яны змогуць у поўнай меры рэалізаваць свае перавагі і дасягнуць высокіх аб'ёмаў вытворчасці. І таму на мясцовым узроўні трэба ўсімі сродкамі садзейнічаць утварэнню новых прыватных прадпрыемстваў і развіццю малога бізнесу (мал.).




Мал. Крыніцы лакальных канкурэнтных перавагаў

Варта зазначыць, што фізічны памер унутранага попыту, на які традыцыйна робіць стаўку дзяржаўная эканамічная палітыка Беларусі, значна меней істотны, чым яго характар. Менавіта дасведчанасць і патрабавальнасць мясцовых спажыўцоў з'яўляюцца рухавіком развіцця прадпрыемстваў рэгіёну і дазваляюць апошнім паспяхова спаборнічаць за пакупнікоў па-за межамі рэгіёну і такім чынам павялічваць аб'ёмы рэалізацыі прадукцыі. Зноў жа, улічыць і развіваць на карысць нацыянальнай эканомікі спажывецкія перавагі і патрабаванні ўнутранага рынку магчыма толькі пры наяўнасці канкурэнцыі, у тым ліку з боку замежных вытворцаў.

Што датычыць наяўнасці матэрыяльных фактараў вытворчасці, то актуальна для эканомікі Беларусі зазначыць, што нельга негатыўна ацэньваць недахоп мясцовых энергарэсурсаў і сыравіны, паколькі адсутнасць сыравінных галінаў у рэгіёне спрыяе эканоміі, стымулюе выкарыстанне высокатэхналагічнага абсталявання, што будзе садзейнічаць канкурэнтаздольнасці рэгіёну, асабліва ў доўгатэрміновай перспектыве.

Сістэмны характар фармавання і ўплыву лакальных канкурэнтных перавагаў прыводзіць да кшталтавання на мясцовым узроўні адмысловага атачэння, якое падтрымлівае з'яўленне і развіццё канкурэнтаздольных роднасных і сумежных галінаў, сукупнасць якіх М. Портэр паклаў у аснову паняцця «прамысловы кластэр» (*industrial cluster*). Сутнасць прамысловага кластэру ў камбінацыі *канкурэнцыі* і *каапераціі*. Згодна з больш дэталёвымі вызначэннямі Портэра, кластэр – гэта «геаграфічнае згуртаванне ўзаемазвязаных кампаніяў, спецыялізаваных пастаўшчыкоў, гандляроў паслугамі, фірмаў з роднасных галінаў і асацыяваных інстытуцыяў (напрыклад, універсітэтаў, установаў па стандартызацыі, гандлёвых аб'яднанняў) у асобнай сферы дзейнасці, якія канкуруюць і ў той жа час супра-

цоўнічаюць» [2, с. 205], або «згуртаванне геаграфічна блізкіх узаемазвязаных кампаніяў і спалучаных з імі інстытуцыяў, якія дзейнічаюць у вызначанай сферы і характарызуюцца агульнасцю і ўзаемадапаўняльнасцю дзейнасці» [2, с. 207].

Прыведзеныя вызначэнні дазваляюць зрабіць выснову, што ідэя кластэру мае два ключавыя моманты. Першая фундаментальная рыса – звязкі (*links*), якія маюць суб'екты кластэру. Гэтыя звязкі могуць быць вертыкальныя (ланцужкі пакупнікоў і прадаўцоў) і гарызантальныя (камплементарныя прадукты і паслугі, выкарыстанне падобных выдаткаў, тэхналогіяў, інстытуцыяў). Акрамя таго, большасць звязкаў уключае сацыяльныя повязі, якія плённа ўплываюць на развіццё фірмаў. Другая вызначальная рыса кластэру – геаграфічная блізкасць (*geographic proximity*) узаемазвязаных кампаніяў і іншых удзельнікаў кластэру. Сумеснае месцазнаходжанне заахвочвае і ўзмацняе перавагі па стварэнню новай вартасці, заснаваныя на ўзаемадзеянні паміж фірмамі.

Згодна з Портэрам, кластэр з'яўляецца крыніцай развіцця лакальных канкурэнцыйных перавагаў (метафарычны ромб аўтара), якія фармуюцца трыма асноўнымі спосабамі [2, с. 221–233]. Па-першае, праз павышэнне прадукцыйнасці фірмаў, якія ўваходзяць у кластэр, за кошт узаемадапаўняльнасці дзейнасці і доступу да спецыялізаваных фактараў вытворчасці, інфармацыі, інфраструктуры і г. д. Па-другое, праз рост здольнасці да інавацыяў. Па-трэцяе, праз стымулы для ўзнікнення ў межах кластэру новага бізнесу.

Вышэйадзначаныя асаблівасці канцэпцыі кластэраў дазваляюць акрэсліць асноўныя напрамкі даследаванняў па яе выкарыстанню ў Беларусі, якія вынікаюць з фундаментальных рысаў кластэраў. Па-першае, гэта датычыць існавання ў краіне інстытуцыянальных праблемаў па стасаванню звязкаў паміж фірмамі, выкананню кантрактаў і абмену інфармацыяй. Разам з традыцыйнымі абмежаваннямі, што існуюць у эканоміцы (абмежаванасць рэсурсаў), заканадаўча створаныя абмежаванні-інстытуты вызначаюць структуру эканамічных стымулаў грамадства і кірунак эфектыўнага развіцця эканомікі. Незавершанасць фармавання ў краіне рынкавых інстытутаў (цвёрдых правоў прыватнай уласнасці, забеспячэння выканання кантрактаў і г. д.) павялічвае трансакцыйныя выдаткі прадпрыемстваў і дазваляе меркаваць аб наяўнасці ў краіне феномену «інтстытуцыянальных пастак», што стрымліваюць эканамічнае развіццё. У той жа час у межах кластэру эканамічныя стымулы могуць праяўляцца больш моцна, а ўплыў нефармальных адносінаў і частых кантрактаў можа садзейнічаць памяншэнню трансакцыйных выдаткаў. Па-другое, паколькі сацыяльна-эканамічныя повязі ў кластэрах, якія забяспечваюць развіццё канкурэнцыйных перавагаў, нельга разглядаць у адарванасці ад прасторавай лакалізацыі, то ў Беларусі можна прагназаваць пашырэнне даследаванняў праблемаў рэгіянальнай палітыкі, эфектаў і перспектываў дэцэнтралізацыі кіравання краінай.

У межах вызначаных фундаментальных напрамкаў даследаванняў можна вылучыць шэраг больш спецыфічных пытанняў. Так, даволі актуальнай для родных галінаў прамысловасці краіны з'яўляецца распрацоўка сумесных стратэгіяў рэструктурызацыі прадпрыемстваў у межах кластэру. Напрыклад, змяненне ў працэсе лесанарыхтоўкі тэхналогіі высечак і сарціроўкі, у лесапіленні ўдасканаленне апрацоўкі драўніны дазволіць значна павысіць эфектыўнасць глыбокай перапрацоўкі драўніны, у тым ліку мэблевай вытворчасці. Такая стратэгія можа прадугледжваць развіццё вытворчасцяў па комплекснай перапрацоўцы лясных рэсурсаў, хімічнай перапрацоўцы дробнапамернай сыравіны. Асабліва важнымі такія стратэгіі могуць быць для невялікіх гарадоў краіны, дзе значная частка насельніцтва занятая на прадпрыемствах ляснога комплексу.

Вельмі актуальным з'яўляецца даследаванне праблемаў росту інавацыйнасці эканомікі на аснове стварэння ўмоваў для ўзаемавыгадных сувязяў даследчыцкіх і адукацыйных асяродкаў з вытворчасцю. Напрыклад, БДТУ ужо мае заўважную скіраванасць на повязі з прадпрыемствамі лесахімічнага комплексу. Аднак прыкладна 50% навукова-тэхнічнай прадукцыі і распрацовак, якія фінансуюцца з інавацыйнага фонду канцэрна «Белнафтахім», выконваюцца арганізацыямі іншых краінаў. Нацыянальныя навуковыя і

адукацыйныя ўстановы забяспечваюць толькі лакальныя патрэбы хімічнага комплексу. Важным момантам у павышэнні стымулаў да інавацыяў нацыянальных прадпрыемстваў з'яўляецца распрацоўка адпаведнай навукова-тэхнічнай палітыкі, у якасці інструменту якой можа быць плённа выкарыстана канцэпцыя прамысловых кластэраў. І гэты інструмент, які атаесамляецца з «эканомікай, заснаванай на ведах» (*knowledge–based economy*), паспяхова прымяняецца як міжнароднымі арганізацыямі, так і нацыянальнымі урадамі, агенцыямі рэгіянальнага развіцця і лакальнымі ўладамі развітых і стаўшых на шлях развіцця краінаў [7, 8].

ЛІТАРАТУРА


1. Валетка У.У. Асаблівасці рэструктурызацыі нацыянальнай гаспадаркі Беларусі ва ўмовах трансфармацыйнага перыяду // Труды БГТУ. Сер. эконом. и управления. 2003. Вып. XI. С. 108–111.
2. Портер М. Конкуренция / Пер. с англ. М.: Изд. дом «Вильямс», 2000. 495 с.
3. Coyle, D. (2001) *Paradoxes of Prosperity: Why the New Capitalism Benefits All*, London: Texere Publishing.
4. Methods of Interregional and Regional Analysis. W. Isard, et al. Ashgate Ltd. 1998.
5. Кругман П., Обстфельд М. Международная экономика. 5-е изд. СПб.: Питер, 2003. 832 с.
6. Martin, R. and Sunley, P. (2001) «Deconstructing Clusters: Chaotic Concept or Policy Panacea?» Revised Version of a Paper Presented at the Regional Studies Association Conference on *Regionalising the Knowledge Economy*, London.
7. OECD (2001) *Innovative Clusters: Drivers of National Innovation Systems*, Paris.
8. World Bank (2000) *Electronic Conference on Clusters*, World Bank.